# ДЫЯСПАРА
# КУЛЬТУРАЛОГІЯ
# ГІСТОРЫЯ



28

БЕЛАРУСІКА ALBARUTHENICA

# ДЫЯСПАРА
# КУЛЬТУРАЛОГІЯ
# ГІСТОРЫЯ

## МАТЭРЫЯЛЫ
## IV МІЖНАРОДНАГА КАНГРЭСА
## БЕЛАРУСІСТАЎ
## «БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРА Ў КАНТЭКСЦЕ
## КУЛЬТУР ЕЎРАПЕЙСКІХ КРАІН»

**Мінск, 6–9 чэрвеня 2005 г.**

МІНСК «ГОЛАС РАДЗІМЫ» 2006

УДК 008 (476:4) (043.2)
ББК 71 (4Беи)
Д 91

*Серыя заснавана ў 1993 годзе*

П а д р э д а к ц ы я й
Адама Мальдзіса, *доктара філалагічных навук, прафесара*
Алеся Смаленчука, *доктара гістарычных навук, прафесара*

Р э д а к т а р ы в ы к а з в а ю ц ь п а д з я к у
спадарыні Алене Міхалюк –
за дапамогу ў падрыхтоўцы рукапісу да друку;
Камітэту па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце
Міністраў Рэспублікі Беларусь –
за фінансаванне выдання зборніка.

Д 91 **Дыяспара. Культуралогія. Гісторыя:** матэрыялы IV Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў кантэксце культур еўрапейскіх краін» (Мінск, 6–9 чэрв. 2005 г.) / пад. рэд. А. Мальдзіса, А. Смаленчука – Мн.: Рэд. газ. «Голас Радзімы», 2006. – 360 с. – (Беларусіка = Albaruthenica; кн. 28)

У зборнік уключаны даклады і паведамленні, прачытаныя на пасяджэннях IV Міжнароднага кангрэса беларусістаў, прысвечаныя праблемам дыяспары, культуралогіі і гісторыі. Кніга прызначана беларускім і замежным навукоўцам, выкладчыкам, настаўнікам, студэнтам.

**УДК 008 (476:4) (043.2)**
**ББК 71 (4Беи)**

ISBN 985-90093-1-7 © ГА «Міжнародная асацыяцыя беларусістаў», 2006

праблемы, беспадстаўнага пазбаўлення грамадзянства, абвінавачванняў у бальшавізме і г.д. Паводле Б. Тарашкевіча, «сучасная дзяржаўнасць [...] павінна забяспечыць усім грамадзянам наогул і кожнаму паасобку незалежна ад расы, ад рэлігіі, ад поглядаў роўнасць і роўныя правы. Дзяржава толькі тады можа існаваць, толькі тады можа быць цярпіма, калі роўна будзе апекавацца ўсімі нацыянальнасцямі, не перашкаджаючы нікому, хто хоча развіваць сваю мову і культуру. Але калі дзяржава гэтых заваёў не выканае – траціць апраўданне свайго існавання, становіцца прычынай нязгоды грамадства, будзе абвінавачана судом роду чалавечага і змушана будзе або перастаць існаваць, або адмовіцца ад выканання такой немагчымай палітыкі...» Напрыканцы ён выклаў у сойме праграму, з якой прыйшлі беларускія дэпутаты ў польскі парламент. У аснове яе было патрабаванне аўтаноміі. Праграма была выпрацавана тагачаснай беларускай элітай у Вільні і прайшла юрыдычную апрабацыю ў славутага адваката Тадэвуша Урублеўскага.

Такім чынам, можна сказаць, што ў публіцыстыцы Б. Тарашкевіча пачатку 20-х гг. адлюстраваліся актуальныя праблемы жыцця беларускага народа, яго сацыяльныя, палітычныя і культурныя актуаліі. У ёй былі пазначаны асноўныя пытанні, якія хвалявалі шырокія колы беларускага грамадства. Публіцыстыка Браніслава Тарашкевіча вылучалася багаццем зместу, пранікнёнасцю, дасціпнасцю і моцнай інтэлектуальнай энергетыкай. Але гэта ўжо тэма асобнай гаворкі.

*АЛЯКСАНДР ВАБІШЧЭВІЧ (Брэст, Беларусь)*

## ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА ЭТНІЧНЫХ СУПОЛЬНАСЦЕЙ ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАГА РЭГІЁНА Ў СКЛАДЗЕ ПОЛЬШЧЫ (20 – 30-Я ГАДЫ ХХ СТАГОДДЗЯ)*

Беларуская прысутнасць ў нацыянальна-культурным жыцці Заходняй Беларусі 1920–1930-х гг. ужо працяглы час даследуецца ў айчыннай гістарыяграфіі. Аднак варта звярнуць увагу на пытанні грамадскага і культурнага жыцця меншых этнічных супольнасцей – яўрэяў, рускіх, украінцаў, літоўцаў, татараў.

У міжваеннай Польшчы яўрэі складалі каля 10% жыхароў. Адчувальнай была іх прысутнасць у заходнебеларускім рэгіёне. Паводле перапісаў

* Артыкул падрыхтаваны пры падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў у межах праекта Г05Р – 027

насельніцтва 1921 і 1931 гг., яўрэі складалі ў Палескім ваяводстве адпаведна 14,3% і 10,1%, Навагрудскім – 9,2% і 7,8%, Віленскім – 5,2%. У асобных гарадах і мястэчках яўрэі складалі больш паловы жыхароў: у Слоніме – 71,7%, Лідзе – 61,7%, Наваградку – 53,5%[1]. Нягледзячы на канстытуцыйныя гарантыі і міжнародныя абавязацельствы Польшчы, яны фактычна не атрымалі матэрыяльнай падтрымкі для ўласных школ з выкладаннем на ідыш і іўрыце. Таму іх навучальныя ўстановы мелі прыватны характар. Яўрэйскія школы ўтрымліваліся за кошт платы за вучобу, невялікіх субсідый гмін і ахвяраванняў яўрэйскага насельніцтва. Дапамога аказвалася таксама з-за мяжы.

Вялікая ўвага надавалася рэлігійнаму выхаванню яўрэйскай моладзі ў хедэрах (пачатковых школах для хлопцаў). Дзеці 3 – 5-гадовага ўзросту вучыліся там чытаць і пісаць на іўрыце, потым пераходзілі да чытання фрагментаў Торы (Пяцікніжжа). Дзейнічалі таксама талмудычныя школы, школы «Бет-Якаў» для дзяўчат. Некаторыя з яўрэйскіх юнакоў, што скончылі хедэры, працягвалі бясплатна вучобу ў вышэйшых рэлігійных установах – ешыботах (іешывах). Там найперш вывучалі Талмуд з каментарыямі і рыхтавалі рабінаў. Ешыботы былі цэнтрамі іудзейскай тэалагічнай думкі, месцамі выхавання духоўнай эліты яўрэяў. Гэтыя навучальныя ўстановы ўтрымліваліся на ахвяраванні яўрэйскіх арганізацый, абшчын і прыватных асоб. Узорам для іншых талмудычных школ стаў ешыбот у Валожыне, які быў заснаваны яшчэ ў 1802 г. і тройчы беспаспяхова закрываўся расійскім царызмам. Валожынскі ешыбот, які падрыхтаваў многіх яўрэйскіх інтэлектуалаў, праіснаваў да 1942 г. Сусветную вядомасць меў ешыбот у Міры, заснаваны яшчэ ў 1815 г. Высокім узроўнем навучання вылучаўся і ешыбот у Лідзе. Навучальныя ўстановы гэтага тыпу дзейнічалі ў Клецку, Слуцку, Баранавічах, Кобрыне, Брэсце, Пінску, Наваградку, Гродне, а таксама ў Вільні і Беластоку.

Даволі ўплывовым было Аб'яднанне яўрэйскіх школ (створана ў 1921 г.), якое апекавалася пачатковымі і сярэднімі навучальнымі ўстановамі для яўрэйскіх дзяцей, што вывучалі ідыш. Ужо ў 1924 г. у Палескім ваяводстве дзейнічала дзевяць яго філіялаў[2]. Бунд і Палей Цыён, якія выступалі з ідэямі культурна-нацыянальнай аўтаноміі яўрэйскага насельніцтва, аказвалі ўплыў на гэтую асветніцкую арганізацыю.

Уплывовым у гарадах і мястэчках было яўрэйскае культурна-асветніцкае таварыства «Тарбут» («Культура»). Толькі на працягу 1929 – 1930 гг. у Палескім ваяводстве было адкрыта каля 30 рэгіянальных прадстаўніцтваў гэтай арганізацыі. У 1936 г. там было 11 пачатковых школ, 1 гімназія, што ўтрымліваліся дадзеным таварыствам[3]. Прыватны характар яўрэйскіх школ ускладняў перспектыву іх існавання, бо пасля заканчэння вучобы не было шансаў адразу трапіць у польскія ВНУ.

---

[1] Najnowsze dzieje żydów w Polsce w zarysie (do 1950 roku)/ Pod red. J. Tomaszewskiego. – Warszawa, 1993. – S. 161 – 162.

[2] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). Ф. 1. Воп. 9. Спр. 1183. Арк. 23.

[3] Тамсама. Спр. 879. Арк. 5.

У гарадах і мястэчках Заходняй Беларусі дзейнічалі шматлікія кнігарні, бібліятэкі, чытальні, якія ўтрымліваліся яўрэйскімі партыямі, культурна-асветніцкімі арганізацыямі, сінагогамі, прыватнымі асобамі. Яўрэйскае насельніцтва мела магчымасць чытаць разнастайныя мясцовыя перыядычныя выданні пераважна на ідыш, а таксама іўрыце і польскай мове.

Духоўным цэнтрам яўрэяў усёй Усходняй Еўропы з'яўлялася Вільня. Там актыўна займаўся даследчыцкай дзейнасцю Яўрэйскі навуковы інстытут, які быў заснаваны ў 1925 г. Асноўныя яго мэты былі наступныя: адлюстраванне любых праяў жыцця яўрэяў, вывучэнне з дапамогай новых метадаў іх мінулага і інш.[4] Планавалася пераўтварыць гэты свецкі навуковы інстытут у яўрэйскую ВНУ, але рэалізаваць ідэю не ўдалося. Ім паспяхова праводзіліся даследаванні ў галіне мовазнаўства, этнаграфіі, сацыялогіі, эканамічнай навукі. Матэрыяльную падтрымку аказвалі арганізацыі яўрэйскай дыяспары з-за мяжы, а таксама мясцовае насельніцтва. Сярод ахвярадаўцаў у 1927 – 1929 гг. былі таксама яўрэйскія гміны і органы самакіравання з Гродна, Ліды, Глыбокага, Пінска, Слоніма, Ваўкавыска, Баранавічаў, Брэста, Ашмянаў, Пружанаў і іншых гарадоў[5]. Частка велізарнага кнігазбору і архіва інстытута загінула ў гады Другой сусветнай вайны. Найбольшая колькасць уцалелых дакументальных матэрыялаў захоўваецца цяпер у Нью-Йорку[6].

Акрамя згаданага інстытута, свой уклад у культурнае жыццё ў Вільні ўнеслі Яўрэйскае гісторыка-этнаграфічнае таварыства, музей, школа мастацкіх рамёстваў. З 1923 г. у гэтым горадзе штогод наладжваліся выставы яўрэйскіх мастакоў. Плённа працавалі ў Вільні Б. Цукерман, Б. Залкінд, М. Ляйбоўскі і іншыя жывапісцы. Самабытныя асяродкі яўрэйскага выяўленчага мастацтва былі створаны ў Беластоку, Гродне і іншых мясцінах.

Нягледзячы на цяжкасці і перашкоды, праявы антысемітызму, яўрэйскае насельніцтва настойліва захоўвала і развівала нацыянальную культуру. У прыватнасці, на Віленшчыне яўрэі не ідэнтыфікавалі сябе ні ў культурных, ні ў грамадска-палітычных адносінах з польскай супольнасцю[7]. Ніводная з яўрэйскіх партый ці арганізацый не выступала з пазіцыі нацыянальна-культурнага нігілізму. Яўрэйскія грамадскія структуры здолелі мабілізаваць уласныя рэсурсы для самазахавання ва ўмовах мэтанакіраванай асіміляцыі з боку Польскай дзяржавы.

Руская меншасць складала нязначную колькасць насельніцтва на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У 1931 г. у Палескім ваяводстве сярод жыхароў рускіх налічвалася 1,4%, Навагрудскім – 0,6%, Віленскім – 3,4% (у межах усёй Польскай дзяржавы – толькі 0,4%)[8]. Ва ўмовах паланізацыі рускаму насельніцтву таксама

---

[4] Żydowski instytut naukowy (JIWO), jego cele i dorobki. Wilno, 1931. S. 3.
[5] Тамсама. С. 7 – 8.
[6] Запісы / Беларускі інстытут навукі й мастацтва. 2003. № 26; Minczeles H. Vilna, Wilno, Vilnius: La Jérusalem de Lituanie. Paris, 2000. P. 296.
[7] Mendelsohn E. Żydzi Europy środkowo-Wschodniej w okresie międzywojennym. Warszawa, 1992. S. 82–83.
[8] Tomaszewski J. Ojczyzna nie tylko polaków: Mniejszości narodowe w Polsce w latach 1918 – 1939. Warszawa, 1985. S. 149.

неабходна было клапаціцца пра захаванне ўласнай духоўнай культуры. У многіх заходнебеларускіх гарадах ўзніклі філіялы Рускага дабрачыннага таварыства, створанага ў 1924 г. у Варшаве. Пры іх утрымліваліся рускія школы, бібліятэкі, ствараліся літаратурныя, тэатральныя гурткі, іншыя творчыя аб'яднанні. У Вільні ў пачатку 1920-х гг. функцыянаваў шэраг рускіх тэатральных калектываў – ансамбль сцэнічных дзеячаў, тэатр «Рэдута», музычна-драматычны гурток і іншыя. У пачатку 1930-х гг. у Палескім ваяводстве пасля непрацяглага выдання былі закрыты польскімі ўладамі дзве газеты на рускай мове за «нелаяльныя адносіны да польскай дзяржаўнасці і прапаганду вялікадзяржаўных манархічных поглядаў»[9]. З сямі рускамоўных газет, што друкаваліся ў 1930-я гг. у Польшчы, тры выходзілі ў Вільні.

Да 1932 г. на заходнебеларускіх землях існавалі нешматлікія рускія прыватныя навучальныя ўстановы – пачатковыя і рэальныя школы, гімназіі. У Палескім ваяводстве дзейнічалі руская гімназія ў Брэсце, рэальныя школы ў Пінску, Лунінцы. У Навагрудскім ваяводстве існавалі дзве рускія школы, у Вільні да сярэдзіны 1930-х гг. засталася толькі адна прыватная руская гімназія[10]. Становішча гэтых навучальных устаноў увесь час ускладнялася. У маі 1935 г. апякунства Віленскай школьнай акругі паведамляла кіраўніку рускай пачатковай школы ў Баранавічах аб намеры закрыць установу за «шкодны выхаваўчы ўплыў на моладзь», які праявіўся «ў дапушчэнні існавання нелегальнай скаўцкай дружыны, адсутнасці правядзення для вучняў дзяржаўных урачыстасцей і слабым клопаце аб вывучэнні дзяржаўнай (*польскай – А.В.*) мовы»[11]. Праз некалькі месяцаў гэтая пачатковая школа з рускай мовай выкладання ў Баранавічах была закрыта.

Некаторае ажыўленне культурна-асветніцкай працы назіралася ў рускіх-стараабрадцаў, якія жылі на тэрыторыі Браслаўскага, Дзісенскага, Пастаўскага, Ашмянскага, Свянцянскага паветаў, у наваколлі Вільні. У лютым 1937 г. намаганнямі іх абшчын дзейнічала 11 бібліятэк-чытальняў. Аднак з-за матэрыяльных цяжкасцей яны не маглі поўнасцю задаволіць духоўныя патрэбы гэтай этнічна-канфесійнай групы насельніцтва (толькі ў Віленскім ваяводстве налічвалася тады 44 абшчыны стараабрадцаў)[12].

Украінская меншасць на тэрыторыі заходнебеларускага краю пераважала ў Кобрынскім, Брэсцкім і іншых паветах Палескага ваяводства, дзе паводле дадзеных перапісаў насельніцтва складала ў 1921 г. 6,6% (у 1931 г. – 4,8%)[13]. У сакавіку 1923 г. польскія ўлады зарэгістравалі ў Брэсце ўкраінскае культурна-асветніцкае таварыства «Просвіта». Яго мэтай з'яўлялася «развіццё асветы і ўздым культурнага становішча ўкраінскага насельніцтва Палесся»[14]. Таварыствам былі адкрыты бібліятэкі-чытальні, драмгурткі. У 1924 г. удалося

[9] ДАБВ. Ф. 1. воп. 8. спр. 794. арк. 20

[10] Тамсама. Ф. 59. воп. 5. спр. 6679. арк. 16.

[11] Цэнтральны дзяржаўны архіў Літвы (ЦДАЛ). Ф. 247. воп. 1. спр. 5. арк. 5.

[12] Тамсама. Ф. 1681. воп. 1. спр. 435. арк. 22, 5 адв.

[13] ДАБВ. Ф. 1. воп. 9. спр. 45. арк. 5.

[14] Статут Українського товариства «Просвіта» на Поліссі. Brześć n/B., 1928. S. 3.

заснаваць прыватную 7-класную ўкраінскую школу ў Брэсце. Паступова разгортвалася сетка арганізацыйных адзінак «Просвіты»: у 1928 г. на тэрыторыі Палескага ваяводства існавала 112 гурткоў (1601 чал.), у 1929 г. – 127 (1754 чал.). Дзейнічалі таксама бібліятэкі-чытальні «Просвіты» (у пачатку 1929 г. іх было 127), кааператывы, распаўсюджваліся часопісы і газеты на ўкраінскай мове.

Пад ударамі адміністрацыйна-паліцэйскіх уладаў моц «Просвіты» слабела. У 1930 г. уцалелі толькі 79 гурткоў (1534 чал.), на наступны год – 56 (1031 чал.)[15]. У 1933 г. былі ліквідаваны сельскія бібліятэкі-чытальні «Просвіты». Захаваліся толькі два гурткі і адна бібліятэка-чытальня, на мяжы закрыцця была адзіная ўцалелая ўкраінская школа ў Брэсце. Фактычна дзейнасць «Просвіты» у Палескім ваяводстве з сярэдзіны 1930-х гг. прыйшла ў заняпад.

Адносіны да нацыянальна-культурных патрэбаў літоўскай меншасці з боку ўладаў міжваеннай Польшчы у многім залежалі ад агульнага характару польска-літоўскіх узаемаадносін. З самага пачатку 1920-х гадоў ў адносінах да літоўцаў праяўляўся гвалт, «амаль усіх літоўскіх інтэлігентаў абвясцілі чужаземцамі»[16]. У пададзеным у жніўні 1922 г. у Лігу нацый мемарандуме адзначалася: «Наша культура, нават само нашае існаванне знаходзяцца ў небяспецы. Палякі адкрыта праводзяць знішчэнне ўсёй літоўскай культуры»[17]. Нацыянальна-культурныя інтарэсы абараняла літоўскае асветніцкае таварыства «Рытас». Літоўскія пачатковыя школы (пераважна прыватныя) знаходзіліся ў сельскай мясцовасці ў Віленскім, Браслаўскім, Ашмянскім, Лідскім, Гродзенскім, Сувалкаўскім і Слонімскім паветах. Паводле розных ацэнак, да 1926/27 навучальнага году колькасць літоўскіх школ узрасла да 145 – 170[18]. Актыўна займалася культурна-асветніцкай працай сярод літоўскага насельніцтва таварыства св. Казімераса, якое стварыла да 1934 г. больш 400 гурткоў, якія аб'ядналі звыш 16 тыс. чалавек[19] Аднак да 1937/38 навучальнага году ацалелі толькі дзве літоўскія і 30 польска-літоўскіх школ. У лютым 1938 г. польская адміністрацыя забараніла дзейнасць таварыства «Рытас».

Прысутнасць татарскай супольнасці адчувалася ў Віленска-Трокскім, Навагрудскім, Лідскім, Браслаўскім, Нясвіжскім, Слонімскім, Гродзенскім і іншых паветах Віленскага, Навагрудскага і Беластоцкага ваяводстваў (у 1935 г. усяго ў Польшчы налічвалася 5425 татараў)[20]. Нягледзячы на сваю нешматлікасць, мясцовыя татары-мусульмане імкнуліся да захавання сваёй нацыянальна-рэлігійнай самабытнасці. Акрамя абвяшчэння аўтакефаліі мусульманскай царквы ў Польшчы (у снежні 1925 г.), былі ўтвораны агульнапольскі Культурна-асветніцкі саюз татараў, татарскі музей і архіў у Вільні.

---

[15] ДАБВ. Ф.1. воп. 9. спр. 46. арк. 69.
[16] ЦДАЛ. Ф. 172. воп. 1. спр. 1366. арк. 280.
[17] Тамсама. Арк. 49 – 50.
[18] Makowski B. Litwini w Polsce, 1920 – 1939. Warszawa, 1986. S. 193; Kiaupa Z. Lietuvos valstybės istorija. Vilnius, 2004. P. 217.
[19] Lidas krašto lietuviai: Monografija. 2 tomai. Kaunas, 2002. P. 153.
[20] Miśkiewicz A. Tatarzy polscy 1918–1939: Życie społeczno-kulturalne i religijne. Warszawa, 1990. S. 63.

Цэнтральная рада Культурна-асветніцкага саюза татараў выдавала па-польску навуковы, літаратурны часопіс «Татарскі Рочнік». У 1930 г. у Варшаве мусульманская абшчына пачала выданне польскамоўнага часопіса «Ісламскі агляд». Звесткі пра рэлігійнае жыццё змяшчаліся і на старонках штомесячніка «Татарске жыцце» (Вільня). Дзеля задавальнення духоўных патрэб мясцовых татараў выпускаліся мусульманскія календары, падручнікі, асобныя суры з Карана на арабскай і польскай мовах. Удалося аднавіць і пабудаваць мячэці ў Ляхавічах, Мядзелі, Відзах. У пачатку 1930-х гг. у Польскай дзяржаве дзейнічала 19 мусульманскіх абшчын, з іх абсалютная большасць размяшчалася ў Заходняй Беларусі[21]. Актыўнасцю вылучаліся абшчыны ў Іўі, Навагрудку, Докшыцах, Слоніме, Міры, Клецку. Вялікая ўвага надавалася рэлігійнай адукацыі дзяцей з татарскіх сем'яў.

У заходняй частцы Беларусі, дзе спрадвеку разам з тытульным этнасам (беларусамі) жылі прадстаўнікі іншых супольнасцей, у 1920–1930-я гг. склаліся неспрыяльныя ўмовы для іх духоўнага развіцця. Нягледзячы на міжнародныя абавязанні, канстытуцыйна-прававыя нормы, Польская дзяржава так і не змагла поўнасцю задаволіць інтарэсы нацыянальных меншасцей у галіне культуры, асветы і навукі. Разам з беларусамі яўрэі, рускія, украінцы, літоўцы і іншыя этнічныя супольнасці (акрамя палякаў) не атрымалі магчымасцей для паўнапраўнага нацыянальна-культурнага развіцця. Але яны спрабавалі самастойнымі і зрэдку сумеснымі намаганнямі супрацьстаяць паланізацыі, захаваць свае духоўныя каштоўнасці.

*АНДРЭЙ ВАШКЕВІЧ (Гродна, Беларусь)*

# ВІЛЕНСКАЯ ГАЗЕТА «БЕЛАРУСКІ ФРОНТ» І ПРАБЛЕМА ПОЛІЭТНІЧНАГА ВЫБАРУ БЕЛАРУСАЎ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1930-Х ГАДОЎ

Газета «Беларускі фронт», што выдавалася ў Вільні ў 1936–1939 гг. групоўкай, створанай ксяндзом Вінцэнтам Гадлеўскім, ніколі не была прадметам спецыяльнай увагі даследчыкаў па дзвюх галоўных прычынах. Па-першае, гісторыкам не хапала звестак для напісання нават самага агульнага нарыса гісторыі газеты і дзейнасці яе выдаўцоў. Архіў рэдакцыі «Беларускага фронту» знік (магчыма, ён быў знішчаны кс. Гадлеўскім перад яго ўцёкамі з Літвы летам 1940 г.), а ў бібліятэках і архівах Беларусі няма ніводнага камплекту

[21] Drozd A., Dziekan M., Majda T. Meczety i cmentarze tatarów polsko-litewskich. Warszawa, 1999. S. 15, 66, 75